Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana gyčałtam

№ 12 (511). Вільня, Нядзеля 19 Сакавіка 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

1863—1918—1933.

Дня 25 сакавіка сёл. году мінае 15 гадоў ад часу, калі ў Менску была абвешчана НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ БЕЛАРУСІ (Б.Н.Р.). На сёлетні-ж год прыпадаюць і 70-тыя УГОДКІ БЕЛАРУСКАЙ ПРЭСЫ, запачаткаванай выхадам у сьвет 1-шай беларускай часопісі „MUŽYCKAJA PRAŬDA“, пад рэдакцыяй Кастуся Каліноўскага.

Каб ушанаваць гэтыя ўгодкі, з ініцыятывы Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, з прадстаўнікоў усяго незалежна-арганізованага беларускага грамадзянства, на шырока-грамадзкіх асновах сарганізаваўся адумыслова Юбілейны Камітэт дзеля сьвяткаваньня 15-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі і 70-тых угодкаў беларускай прэсы.

Сьвяткаваньне абодвух юбілеяў адбудзецца ў суботу 25 сакавіка сёл. году паводле наступнай праграмы:

I.

НАБАЖЭНСТВЫ:

1. *А 10-й гадз. раніцай імша ў касьцеле сьв. Мікалая (зав. сьв. Мікалая);*
2. *А 11.30 гадз. раніцай малебен у Прачысьценскім Саборы (Зарэчча).*

II.

УРАЧЫСТАЯ АКАДЭМІЯ

(В. заля „Апольлё“ вул. Домброўскага 5).

1. *Адчыненьне Акадэміі — старшыня Камітэту СЯРГЕЙ ПАЎЛОВІЧ;*
2. *Рэфэрат на тэму: „Незалежнасьць Беларусі як ідэал — задаткам Незалежнасьці фактычнай“ — студ. СЯРГЕЙ САРОКА;*
3. *Рэфэрат на тэму: „Кастусь Каліноўскі, „Mužyckaja Praŭda“ і ідэя незалежнасьці Беларусі“ — Кс. АДАМ СТАНКЕВІЧ;*
4. *Канцэртны аддзел:*
   а) выступленьне Хору Бел. Студ. Саюзу пад кіраўніцтвам грам. Рыгора ШЫРМЫ і
   б) дэкламацыі.

Пачатак Акадэміі а гадз. 19.30. Уваход па запросінах, бясплатны.

Запросіны выдае бел. кнігарня „Пагоня“, Вільня, Завальная 6—10.

Запрашаем усё грамадзянства прыняць удзел у сьвяткаваньні.

Вільня, Сакавік 1933 г. **ЮБІЛЕЙНЫ КАМІТЭТ.**

З гісторыі беларускага полёнофільства.

Шмат да якіх слоў дачапляем мы «фільства». Дачэпка гэта паходзіць ад грэцкага — любіць што, мілаваць, быць да чаго шчырай душой склонным. З гэтага выходзіць, што слова „полёнофільства“, якое так часта спатыкаем у беларускай асабліва пэрыёдычнай літэратуры, мае азначаць нейкую асаблівую любоў, ці прынамсі прыхільнасьць да Польшчы. Затым аднак, што ў нас слова „полёнофільства“ ўжываецца прадусім у жыцьці палітычным, дык яно азначае палітычную думку тых беларусаў, якія, апіраючыся на Польшч, маюць надзею здабыць хоць часткова правы для беларускага народу, або прынамсі хоць у пэўнай меры аблегчыць гэтага народу палажэньне.

Гэткае палітычнае полёнофільства ў беларускім адраджэнскім руху мае сваю даволі цікавую гісторыю, ведаць якую Беларусам трэба абавязкава.

Пачаткі полёнофільства сягаюць дзевяцьсотых гадоў нашага сталецьця, калі нараджалася „Бел. Рэволюцыйная“, а пасьля „Соцыялістычная Грамада“ ў 1902 г. „Грамада“ гэта ўжо была полёнофільскай у тым сэнсе, што і паўстала яна і пасьля існавала ў многім чым дзякуючы падтрыманьню яе з боку польскіх соцыялістых. Полёнофільства гэта было сапраўды шчырым і прыгожым, бо ажыўляла яго супольная для Беларусаў і Палякоў ідэя барацьбы з расейскай царскай няволяй.

Калі-ж прышлі новыя часы і царскі трон рэвалюцыяй быў перавернуты, гэная беларускае полёнофільства аджыло ўзноў. У выніку Агульнабеларускага Зьезду ў канцы 1917 г. паўстала Рада Зьезду, а пасьля Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, якой 25.III.18 г. было суджана абвесьціць Беларусь незалежнай і стварыць беларускі ўрад, дзеля правядзеньня гэнай незалежнасьці ў чын.

Сярод часткі сяброў Рады Рэспублікі аджыло ўзноў полёнофільства. Частка гэных сяброў думала пры помачы адроджанай незалежнай Польшчы будаваць такую-ж Беларусь. Сябры Рады Рэсп. полёнофілы аддзяліліся ад рэшты сяброў Рады і ў канцы 1919 г. стварылі Найвышэйшую Раду, якая пратрывала больш-менш да 1921 г. Абноўленае гэта полёнофільства з боку Беларусаў было такім-жа шчырым, як і раней, але з боку Палякоў было яно ўжо іншым. Польскія палітыкі адроджанай Польшчы бадай усіх кірункаў ахвотна падтрымлівалі ў Беларусаў полёнофільства, каб лягчэй замацаваць свае пазыцыі на беларускіх землях, Беларусам-жа ў замен не давалі нічога. Яшчэ ў 1921 і 22 г. беларускія полёнофілы з Найв. Рады выдавалі газэту „Бел. Звон“, але ў гэтым ужо часе наступіла ў іх расчараваньне да Польшчы і поўная пачалася дээрцыя з полёнофільскіх радоў.

Палякам аднак Беларусы былі патрэбныя. Лёс Віленшчыны яшчэ ня быў вырашаны. Прыхільны для польскай палітыкі голас Беларусаў быў дужа пажаданы, а нават і неабходны. Беларусы такія знашліся. Выдавалі яны угадова-полёнофільскую газэту „Еднасьць“ і ў пачатку 1922 г. дапамагалі Палякам далучаць Віленшчыну да Польшчы.

У 1922 г. наступілі выбары ў Польскі Сойм і далі Беларусам вялікую перамогу. Беларуская праца закіпела. Народныя масы заварушыліся. Урэшце ў 1924 г. паўстала «Грамада», якая рух беларускіх масаў давяла да нябывалых размераў. Уступак аднак беларускаму народу з боку польскага ўраду ня было і далей, а так-жа ня было і пазытыўнага пляну ў польска-беларускай палітыцы. Пачаліся рэпрэсіі „Грамады“ з аднаго боку, а з другога паявіліся на арэну новыя беларускія полёнофілы, заданьнем якіх было аслабляць дзейнасьць „Грамады“ і Беларускай Хрысьц. Дэмократыі, а так-жа аднача̄сна разьвіваць у Беларусаў угадовасьць да Польшчы. Полёнофільская група гэта працавала ў 1926 і 27 г., выдаючы газэту „Беларускае Слова“.

„Грамада“ урэшце была зламана. Сойм канчаўся. Прыходзілі выбары. Узноў трэба было Палякам пашукаць адпаведных, ужо сьвежых, беларускіх полёнофілаў. У 1927 і 28 г. гэткія Беларусы сапраўды выходзяць на арэну і выдаюць „Беларускі Дзень“. Аказалася аднак, што народ беларускі ўжо да полёнофілаў зьняверыўся і на выбарах за імі ня пойдзе. Група гэта была зьлiквідавана.

У 1928 г., прад выбарамі, пры помачы польскіх палітыкаў, паўстала „Сялянская Партыя“, якая ўзамен за разьбіваньне бел. народнага фронту і за помач Палякам у выбарах, мела ў гісторыі беларускага полёнофільства зачаць цалком новую, карысную для Беларусаў эру на ніве прадусім гаспадарчай і прасьветнай. Група гэта выдавала свой орган „Народ“ і пратрывала да 1930 г. У гэтым часе сябры яе, так-жа расчараваныя да полёнофільства, разышліся хто куды. Група гэта так-жа нічога добрага не зрабіла, а толькі ўвяла ў беларускае жыцьцё лішні закалот, асабліва на выбарах 1928 і 1930 г. Але аб гэта-ж Палякам і расходзілася.

Пасьля ўсяго гэтага здавалася, што полёнофільства сярод Беларусаў ужо не акажацца. Але, як кажуць, „абы балота, а чэрці знайдуцца“. У 1930 г. паўстае новае беларускае полёнофільства, так званае санацыйнае, падшытае сьпярша пад „Грамаду“ і маючае на мэце прадусім аслабляць і лiквідаваць рэштікі яе. Гэта найнавейшае ў Беларусаў полёнофільства існуе аж да сяньня пад назовай бел.-польскай санацыі. Група гэта ў 1930 г. выдавала часопісь „Наперад“ і „Народны Звон“, у 1931/2 г.— „Беларускі Звон“, а сяньня выдае „Родны Край“, у якім сваё полёнофільства старанна хавае, а што ёй незаўсёды ўдаецца. Мае яна так-жа і сваю „культурна-прасьветную“ арганізацыю ТБА. Заданьнем сваім цяперашнія беларускія санацыйныя полёнофілы маюць: вырабляць у беларускім народзе дух польскай дзяржаўнасьці, гадаваць дух угодлівасьці, прывучаць масы і інтэлігенцыю беларускую пагадзіцца з сучасным палажэньнем беларускага народу ў Польшчы, а так-жа аслабляць дзейнасьць беларускіх незалежных культурна-грамадзкіх арганізацыяў і палітычных кірункаў.

Падаём у дужа кароткіх словах гэтыя ўвагі з гісторыі беларускага полёнофільства, каб паказаць, як яно заўсёды служыла толькі інтарэсам польскім, нясучы Беларусам не карысьць, а яўную шкоду.

З гэтых уваг ясна бачым, што польскія палітыкі, замест хоць часткова разьвязаць беларускую справу ў Польшчы, прынамсі ў галіне культурнай і эканамічнай здавольваючы беларускія патрэбы і даючы нам належныя правы, — справу гэту ўсьцяж кідаюць на жыр нізкім палітычным спэкуляцыям.

Пагром беларусаў пад Саветамі.

(Апошнія весткі).

„Чыстка“ ў Наркамасьветы і ў Беларускім Дзяржаўным Выдавецтве.

„Савецкая Беларусь“ № 57 з 13.III.33 г. падае, што вынесена пастанова бюра ЦК КП(б)Б, па якой звальняюцца са становішчаў за „ухіл“: Народны Камісар Асьветы БССР Платун, яго намесьнікі Бялуга, Вальфсон, Рудніцкі, таксама ўсе члены калегіі Наркамасьветы ў цэлым.

Звальняецца таксама са становішча дырэктара Б.Д.В-ва Некрашэвіч, „за дапушчэньне ім у рабоце Б.Д.В. яўна буржуазна-кулацкіх нацыяналістычных тэндэнцыяў, вялікай засьмечанасьці нацдэмаўскімі элемэнтамі апарату Б.Д.В.“... Далейшую „чыстку“ Наркамасьветы і Б.Д.В. даручана Жаброўскаму (паляк), Чарнушэвічу і Ляўкову.

Разгром Вышэйшага Пэдагогічнага Інстытуту ў Менску.

Паводле „Савецкай Беларусі“ № 57 з 13.III.33 г. за „нацдэмаўскі ухіл“ папалі ў няласку шалеючага бальшэвізму прафэсары і навуковыя працаўнікі Пэдінстытуту. Пазвальняны са становішчаў і выкінуты на брук такія асобы: праф. гісторыі Перцаў, праф. гісторыі Заходу Рыўлін, праф. Слуцкі, праф. Стальны, праф. гісторыі СССР Гесен, дырэктар В.П.І. Воўкаў, праф. Чарчяўсі, праф. Віткоўскі (камуніст), праф. Пічэта, дацэнт Якубчык, праф. пэдалёгіі Сарахцін, праф. літэратуры Піотуховіч, праф. рас' літ Барычэўскі, праф. мовазнаўства Багдановіч, праф. гісторыі савецкай гаспадаркі Айзэнбэрг, праф. Артунянц.

Да справы арыштаў вучняў беларускай гімназіі ў Навагрaдку.

Прэзыдыюм Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні апошнімі часамі атрымаў на 10 аркушох апісаныя падзеі прад і падчас арыштаў вучняў Навагрaдзкай беларускай гімназіі ў м-цы студзені с. г. Падпісаны гэныя апісаньні пацярпеўшымі.

Паводле апісаньня, падзеі гэныя страшныя і жудасныя, і вымагаюць разсьледаваньня і пакараньня віноўных.

Дзеля гэтага, як даведваемся, Прэзыдыюм Бел. Нац. К-ту скіроўвуе ўсю гэту справу судова-пракурорскім уладам.

У гэтай-жа справе пасол Ярэміч у Сойме падаў да міністраў унутраных спраў і веравызнаньняў і асьветы інтэрпэляцыю, якую дослоўна друкуем.

„Інтэрпэляцыя

пасла Ф. Ярэміча і тав. да Пана Міністра Нутраных Спраў а так-жа Пана Міністра Веравызнаньняў і Публічнай Асьветы—у справе карыгоднага і недапушчальнага паступку дзяржаўнай паліцыі ў Навагрaдку, як правакацыі, біцьця і катаваньня, а так-жа змушаньня вучняў беларускай гімназіі ў Навагрaдку быць канфідэнтамі.

У жніўні 1932 г. функцыянары тайнай паліцыі ў Навагрaдку: нейкі Здасін пад псэўдонімам „Саша“ і Бітнэр — пад псэўдонімам „Барыс“ зьявіліся на правінцыі да некаторых вучняў Навагрaдзкай беларускай гімназіі, прадстаўляючыся прадстаўнікамі школьнай моладзі і прапанавалі заснаваньне арганізацыі пад назовам „школьнай левіцы“. У гутарках з вучнямі валілі на сучасны Урад і ўрадавую палітыку ў адносінах да народных меншасьцяў, а асабліва на палітыку ў адносінах да беларускага школьніцтва, наракаючы на цяжкія матэрыяльныя варункі вучняў, прапануючы, што як будзе сарганізавана група „школьнай левіцы“, дык будзе выдавана запамога незаможным вучням.

Дня 26 жніўня 1932 г. а гадзіне 20 зьявіліся абодва вышпамянутыя асобнікі, г. зн. „Саша“ і „Барыс» да Кастуся Ханько ў в. Навасёлкі Карэліцкай гм. Навагрaдзкага пав. з прапазыцыяй, каб вучань Ханько згадзіўся належаць да арганізацыі „школьнай левіцы“. Вывялі яго пад прэтэкстам разгаварыцца за вёску. Калі Ханько адказаўся належаць да „школьнай левіцы,“ тады „Саша» дастаў схаваны рэвольвэр, заявіў, што ён „вывядовца» і прыказаў названаму вучню йсьці на пастарунак у Карэлічы, грозячы, што калі той ня пойдзе, дык ён яго заб'е. Прыведзенага на пастарунак Ханько пачалі „бадаць“ (дапытываць). «Барыс“, або Бітнэр, як падпісываўся пасьля на пратаколе, запрапанаваў К. Ханько закончыць справу кампрамісова, г.зн. павінен прызнацца, што належыць да камуністычнай ячэйкі, а так-жа даць дабравольную згоду быць канфідэнтам. К. Ханько гэнай прапазыцыі ня прыняў, матывуючы, што ён вучань і мусіць толькі вучыцца. Тады распачалося „бадане“. Завялі К. Ханько ў нейкі малы пакоік, раздзелі яго і білі гумовымі палкамі ў пяты, змушаючы падпісаць тое, што яны дыктавалі. Калі К. Ханько пачаў шаматацца і вырывацца,—білі яго гумовымі палкамі па галаве і карку датуль, пакуль не заявіў, што падпіша тое, што яму дадуць падпісаць. Прывялі яго ў канцэлярыю і сказалі падпісаць тое, што дыктаваў „Барыс“. К. Ханько, ня маючы адвагі йсьці пад новую катоўню, запрапанаваны пратакол падпісаў.

Апрача гэтага прыказана яму падпісаць пісьмо да Паўла Анішчыка наступнага зьместу: „Паўлік! Пасылаю к табе гэтага чалавека ў ведамай справе. Гавары з ім сьмела.“ Прыказана таксама К. Ханько сьцьвердзіць, што вучаніца VII-ай клясы Кацярына Главінская належыць да камуністычнай ячэйкі, аднак К. Ханько ад гэтага адмовіўся. Тады завялі яго другі раз у той пакой і білі нанова ў пяты праз мокрую анучу, што прычыняе яшчэ большы боль. Ня могучы вытрымаць катаваньня, Ханько згадзіўся падпісаць і тое, што быццам Кацярына Главінская належа да камуністычнай ячэйкі, а так-жа падпісаў дэклярацыю на канфідэнта. На другі дзень яго звольнілі.

У падобны менш-больш спосаб падыходжана і арыштоўвана іншых вучняў, а іменна: Чэрняка Пётру, Вінара Мікалая, Шэнько Мікалая. Мікалая Вінара „Сашка“ выклікаў з бурсы, нагаварваў яго прыняць удзел у арганізацыі, абяцаў матэрыяльную дапамогу і г. д. Аб гэтым усім вучні расказалі дырэктару Навагрaдзкай беларускай гімназіі п. Цеханоўскаму.

Дня 14.I.1933 г. арыштаваны былі вучні ад VI да VIII клясы: Ханько Кастусь, Главінская Кацярына, Анішчык Павал, Чэрняк Пётра, Гуль Уладзімер, Вінар Мікалай і інш. Падчас арышту і рэвізіі (паліцыянты) насьмяхаліся абражаючым спосабам з беларусаў, беларускай гімназіі і беларускай мовы, ня скупячы розных слоў, каторых ня можна тут паўтараць.

Дня 15.I. 1933 г. прывезьлі арыштаваных у Навагрaдак і там таксама пачалося „бадане», ужо ў прысутнасьці паветавага каманданта дзяржаўнай паліцыі нейкага Дэмбіцкага, кіраўніка сьледчай экспозытуры ў Навагрaдку. Білі арыштаваных, зьдзекаваліся рознымі спосабамі, прапанавалі кожнаму паасобку быць канфідэнтам. Кастусь Ханько

Як выглядае ў практыцы беларусізацыя у Б.С.С.Р.

Ужо некалькі разоў пісалі мы аб беларусізацыі БССР., якую бальшавікі праводзяць ад часу стварэньня Беларускай Рэспублікі. Уся бальшавіцкая работа ў гэтым напрамку адна камэдыя. Беларусізацыя праводзіцца толькі на паперы. Цэнтральныя ўлады К.П.(б) і К.П.(б)Б. шмат выдаюць распараджэньняў, прыказаў, пастаноў, закладаюць „пяцілеткі“, вызначаюць тэрміны на выкананьне заданьня „па беларусізацыі,“ але ўсё гэта робіць вялікамаскоўскі шавінізм, пад чырвонай пакрывай, толькі для вонкавага выгляду, для рэклямы, для „уціраньня акуляраў“ заграніцы. „Глядзеце, як камуністычная ўлада дазваляе ўсім нацыям свабодна разьвівацца, тварыць культуру ў роднай мове і агулам поўную свабоду нацыяў.“ Так камуністы абманываюць сьвет і крыўдзяць слабейшыя нацыі. На паперы ўсё можна, бо Ленін гэтак сфармуляваў нацыянальнае пытаньне пры соцыялістычным ладзе, у дзяржаве дыктатуры пралетарыяту. Аднак тэзы Леніна і пастановы цэнтральных уладаў астаюцца мёртвымі словамі на паперы.

У практыцы ўсё выглядае йнакш.

Роўнасьці нацыянальнай ў Савецкіх рэспубліках няма. Пануючай нацыяй ад пачатку існаваньня была і ёсьць расейская нацыя, і расейская мова лічыцца пануючай і афіцыяльнай мовай ува ўсіх Савецкіх Рэспубліках. Як шалеў маскоўскі шавінізм за панаваньня цароў, так шалее і цяпер за панаваньня іншых — чырвоных цароў, толькі з тэй розьніцай, што цяпер дазваляецца на ўсіх мовах праслаўляць новага цара і новы лад.

Зразумела, інтэрнацыянал ёсьць проціўлежнасьцяй усялякай нацыі, ён імкнецца да зьніштажэньня нацыяў — з усіх нацыяў жадае стварыць адну вялікую інтэрнацыянальную сям'ю. І вось мы бачым такім чынам як беларуская нацыя апынулася між двумя мячамі: меч інтэрнацыянальны, які не дазваляе свабодна разьвівацца і меч сільнага маскоўскага шавінізму, які, афарбаваўшыся на бальшавіцкі лад, руйнуе беларускі народ. Для з'ілюстраваньня толькішто сказанага служаць ніжэйпаданыя факты.

Сустракаем часта энтузіястаў з пасярод нашага грамадзянства, якія захопліваюцца тым, што „у Сав. Беларусі ўсё пабеларуску.“ Не, гэта ня праўда. На беларускай мове выдаюцца законы і літэратура прапагандовая, каб беларускі народ лепш зразумеў бальшавіцкую дактрыну. Мова беларуская мовай дзяржаўнай зьяўляецца на паперы, а ў практыцы — мова расейская. Мова беларуская служа за спосаб скамунізаваньня і ўгрунтаваньня камуністычных засадаў. Але калі прасочыць Г.П.У., што нехта да роднай мовы адносіцца з любасьцю, з пашанай, з асаблівым піетызмам, то такую адзінку зараз абвіняюць як „нацдэма“, контррэвалюцыянэра.

Беларус у Сав. Беларусі ня мае права любіць сваю мову, ён павінен аднолькава адносіцца да роднай мовы як і да чужой. Хутчэй той беларус дастане перадавое становішча ў бальшавікоў, які зрусыфікуецца. Гэта ўсё даказвае, што ў Сав. Беларусі няма свабоды для меншых нацыяў. Каб ня быць пустаслоўным, даём голас савецкай прэсе. Вось пісьмо „беларускага“настаўніка, зьмешчанае у № 55 з 25.II. маскоўскай „Правды“. Піша яго чалавек, які на Беларусі праводзіць „беларусізацыю“. Піша ён памаскоўску і замяшчае ў маскоўскай газэце. Чаму-ж не пабеларуску, калі ён беларус? „Правда“ зьмясьціла гэта пісьмо пад громкім загалоўкам: „Буржуазные националисты орудуют!“

„(Письмо учителя).

Я учитель, окончил в Минске университет и в настоящее время работаю преподавателем физики и математики в школе—семилетке в м. Бобре, Крупскаго р-на (БССР).

На работе я говорю только побелорусски. Если увлекаясь скажу что нибудь по-русски, то сейчас же поправляюсь,слежу за собой.

Но в личной семейной жизни я говорю по-русски, просто потому, что на этом языке мне легче говорить.

И вот случился такой инцидент. Одну маленькую записку на имя предсельсовета я случайно(прыпадкова??—*Рэд.*) написал порусски. В это время в школу прибыли зав. райно Чепель и председатель райкома союза рабпрос. т.Голованов.Они выступили с моей запиской на собраннии просвешченцев, заявив, что эта записка фигурировала на пленуме рика и райкома КП(б)Б. и будет фигурировать на сессии ЦИК БССР. Меня обвиняли в махровом великодержавном шовинизме. Выступив, я признал свою ошибку в деле с запиской. (Толькі з запіскай?— *Рэд*). Тут же я подтвердил,что дома все время говорю на русском языке, но не вижу в этом ничего неправильнаго.

После моего об'яснения обвинения усилились. Мне об'явили, что дома в разговоре з женой я должен употреблять исключительно белорусский язык. В результате был по-

жаліўся, што білі яго на пастарунку і біцьцём змушалі падпісаць пратакол. На гэта Дэмбіцкі адказаў: „сяньня дастанеш яшчэ больш“ і ўдарыў некалькі разоў Кастуся Ханько ў твар. Падчас „баданя“ Вінара Мікалая, у каторага забраны яго ўласныя вершы, насьмеваліся з яго і ўдарылі некалькі разоў у твар. Зьбіты моцна Гуль Уладзімер і іншыя. Дапрашываючы Кацярыну Главінскую, п. Дэмбіцкі пытаў яе „ці Каця мае каханка?“ Калі Главінская абурылася на такое пытаньне і адказала, што ў гімназіі не забаўляецца ў аморы, але вучыцца, п. Дэмбіцкі адазваўся: „Ці Каця ня ведае, што гэта ёсьць мужчына?“

Перайшоўшы маральныя і фізычная катаваньні ў паліцыі, былі гэныя вучні адвезены да судзьдзі сьледчага, каторы, дапрасіўшы, пасадзіў усіх іх у вастрог у Навагрудку.

У днях між 10 і 22 лютага с. г. вучні ў большасьці звольнены або за каўцыю па 100 зл., або пэд варункам яўляцца ў азначаным часе да паліцыі.

Пасьле звальненьня ў сьледчым Урадзе п. Дэмбіцкі кожнаму паасобку прапанаваў стацца канфідэнтам. Калі вучні адмовіліся, адказаў: „датуль, дакуль я буду ў Навагрудку, дык табе ня дам скончыць школы і ўпакую цябе ў турму.“

Падаючы гэныя нячуваныя факты надужыцьця, дакананыя навагрудзкай паліцыяй, інтэрпэлянты пытаюць Паноў Міністраў:

1) Ці ведамы Ім гэныя факты?

2) Ці Пан Міністр Нутраных спраў захоча пакараць вышпамянутых функцыянароў Дзяржаўнай Паліцыі і тайных агентаў?

3) Ці Пан Міністр Веравызнаньняў і Публічнай Асьветы захоча ўзяць у абарону вучняў, адданых яму пад апеку навуковых інстытуцыяў — і даць ім магчымасьць кончыць навуку?

Інтэрпэлянты.

Варшава, дн. 9 сакавіка 1933 г.

З беларускага жыцьця.

Юбілейны Камітэт дзеля сьвяткаваньня 15-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі і 70-тых угодкаў беларускай прэсы. З ініцыятывы Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў мінулым тыдні ўтварыўся ў Вільні Юбілейны Камітэт дзеля сьвяткаваньня 15-тых угодкаў Абвешчаньня Беларусі (25.III.1918—25.III.1933) і 70-тых угодкаў беларускай прэсы (1863—1933). Юбілейны Камітэт абымае ўсё незалежна-арганізаванае беларускае грамадзянства ў Зах. Беларусі, аб'еднанае ў Беларускім Нацыянальным Камітэце, Т-ве Беларускае Школы і акадэміцкую моладзь згуртаваную ў Беларускім Студэнскім Саюзе. — Парадак сьвяткаваньня ладжанага Юбілейным Камітэтам паданы ў абвесцы на іншым месцы нашай сяньняшняй газэты.

Этнографічны канцэрт. Дня 18 г. м. Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы, ў унівэрсытэцкай залі Сьнядэцкіх (сьв. Янская вуліца) ў Вільні, а гадзіне 19.30 ладзіць канцэрт беларускай песьні. Цэны білетаў: 2 зл., 1 зл., студ. — 50 гр.

Рэкольлекцыі для беларускай каталіцкай школьнай моладзі, а разам і ўсіх беларусаў-каталікоў у Вільні, пачнуцца ў сераду 22 г. м. а гадз. 17-ай у касьцеле сьв. Мікалая. На кіраўніка рэкольлекцыямі запрошаны кс. праф. Др. Я. Рэшэць.

Лекцыя кс. Гадлеўскага. У Беларускім Студэнскім Саюзе (Вільня, Людвісарская 1—19) дня 16 г. м. прачытаў лекцыю кс. В. Гадлеўскі на тэму „Значэньне хрысьціянства ў грамадзкім жыцьці“.

З выдавецкае нівы. Вышлі з друку:

„Chryścijanskaja Dumka“ — беларуская каталіцкая часопісь, № 3 — сакавік 1933 г. Адрэс: Вільня, зав. сьв. Мікалая 8—3;

„Да Злучэньня“ — беларуская ўніяцкая часопісь, № 3, сакавік 1933 г. Адрэс: Альбэртын каля Слоніма;

„Золак“ (орган маладой беларускай сацыялістычнай думкі) на правох рукапісу, № 2, люты-сакавік 1933 г. Вільня, Млыновая 2—39.

Прадстаўленьне-канцэрт. У нядзелю 12 г. м. Беларускі Студэнскі Саюз ладзіў у Вільні, ў залі Беларускае Філіі Дзярж. гімназіі ім. Ю. Славацкага, прадстаўленьне-канцэрт. Адыграна была камэдыя ў 2-ух актах Я. Хвараста п. н. „На паэтыцкай вышыні“, а хор выканаў некалькі мілагучных беларускіх песьняў. — Камэдыя „На паэтыцкай вышыні“ гэта новы вельмі актуальны сцэнічны твор. Пажадана было-б, каб аўтор гэтае п'ескі паклапаціўся выдаць яе друкам.

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Сымон Рак-Міхайлоўскі дырэктарам Беларускага Дзяржаўнага Музэю. „Чырвоная Беларусь“ № 2—3, 1933 г. падае, што Сымон Рак-Міхайлоўскі, б. грамадаўскі пасол, апошнім часам назначаны дырэктарам Беларускага Дзяржаўнага Музэю ў Менску: перакаталіся мусіць, што да палітыкі ня прыдатны, дык няхай будзе „дырэктарам“.

З Польшчы.

Забастоўкі. Дня 3 г. м. пачалася забастоўка ў трох раёнах польскіх вугальных капальняў: Домброўскім, Шлёнскім і Кракаўскім. Разам бастуе каля 37 тысяч работнікаў. Прычына забастоўкі — абніжэньне заработкаў работнікам. Перагаворы ў гэтай справе да залагоджаньня справы не давялі. Прамыслоўцы заявілі, што калі не абнізяць заработнай платы работнікам, дык тады затопяць капальні. Работнікі пастанавілі ня выходзіць з капальняў, пакуль ня будзе запэўненьня, што капальні ня будуць затоплены. У Лодзі бастуюць работнікі ў 10 трыкотажных фабрыках.

Забурэньні студэнтаў ня спыняюцца. Гэтымі днямі ў Львове арыштавана падчас забурэньняў некалькі студэнтаў; а яны ў арышце павыбівалі вокны.

Чуткі аб зьмене ў урадзе. Газэты падаюць, што маецца падацца ў адстаўку віцэ-міністр вайсковых спраў ген. Славой-Складкоўскі і міністр земляробства і зямельнай рэформы С. Людкевіч.

Скарбовыя боны. Урад падаў у Сойм праект аб выпуску на 200 мільёнаў зл. скарбовых бонаў, каб аблягчыць гэтым грашовы крызыс. Боны будуць у грашовым абегу на раўні з грашовымі банкнотамі.

Узмацненьне варты ў Гданску. Польская ўлада ўзмоцніла вайсковую варту ў марской прыстані м. Гданску, дзе знаходзяцца вялікія склады амуніцыі, бо разышліся чуткі, што якаясь нямецкая арганізацыя хоча гэныя склады ўзарваць. Гэта справа нарабіла нямала шуму на ўсю Эўропу.

Падаткавая шруба цісьне. У працягу ўсяго мінулага бюджэтнага году дзяржаўны скарб сабраў з земляробства 45 з палавінай мільёнаў зл. падатку грунтовага, а ў сёлетнім бюджэтным годзе, за 10 месяцаў ўжо дзяржаўны скарб сабраў гэтага падатку 47 з палавінай мільёнаў зл. Словам, падаткавая шруба сёлета мацней цісьне, бо варункі земляробства не паправіліся і можна сказаць яшчэ пагоршалі, а падатку земляробства заплаціла ўжо больш.

Польскія сьвіні ў СССР. Польскія гандляры сьвіньмі дагаварыліся ў Маскве з савецкай уладай аб гандлю сьвіньмі і сьвінінай. З Польшчы будуць вывозіць у СССР. сьвіней і сьвініну, а адтуль — прывозіць у Польшчу манганавую руду, бавоўну і іншае сыр'ё.

ставлен вопрос аб исключении меня из союза и о снятии с работы.

Только после того, как я согласился с тем, что дома обязан тоже говорить только по белорусски, ограничились тем, что вынесли мне строгий выговор с предупреждением и с занесением в личное дело.

Я признал свои ошибки и чистосердечно решил даже в семье не говорить по-русски, но сомнение в правильности всего этого не дает мне покоя. Неужели, если я заговорю на улице с товарищем или дома с женой на русском языке, я обманываю партию? Нет-ли здесь некоторого перегиба в обратную сторону?

Сьцяпура.“

Бачым, як выкручваецца чырвоны масkоўскі шавініст, апынуўшыся у вагні беларускага нацыянальнага духу. Зрабілася яму так горача, што пачаў прасіць ратунку ў сваіх аднадумцаў — маскоўскіх шовіністаў. А тыя, зразумела, падаюць яму руку, вінавацячы нявінных. Яны пішуць ад Рэдакцыі: „Факты излагаемые в письме, проверены нашим корреспондентом и подтверждаются. Одного из **активных школьных работников** (падкр. Рэд) района ошельмовали и было совсем лишили возможности работать. Материалы, печатавшиеся в „Правде“ за последнее время, свидетельствуют о том, что в **некоторых Партorganizациях Белоруссии не проводится последовательно линия партии о борьбе с уклонами в национальном вопросе на два фронта** — и против великодержавнаго шовинизма, как главной опасности, и против местнаго буржуазнаго национализма.

К сожелению — кажа Масква — ЦК КП(б)Б до сих пор не откликнулся на напечатанные материалы, хотя времени прошло больше чем достаточно.“

Выглядае так, што беларуская мова на Беларусі ёсьць мовай чужой, якой трэба крыху навучыцца ў школе, як нямецкай ці іншай, каб з слоўнікам магчы карыстацца з друку. Ведаем, колькі можа навучыцца бел. мовы паляк у польскіх вучыцельскіх сэмінарыях, калі вучыць гэтай мовы папольску, адначасна робячы кпіны з бел. мовы. Тое самае робіцца і ў „беларускай дзяржаве“, дзе разьвіцьцё нацыяў „забясьпечана правамі“.

Няма народу, калі няма мовы роднай, калі няма да яе любасьці; няма народу, калі няма сям'і. Ці ж сумленна і карысна праводзіцца беларусізацыя маскалямі або жыдамі? — Не!

Аднак, ня гледзячы на сільны тэрор, на дэнацыяналізацыю, на сільную чырвона-маскоўскую асыміляцыю, Беларускі народ Усх. Беларусі ўвесь ахоплены нацыянальным полымем. Беларус сьвядомы і ў меру магчымасьці борыцца з чужацкай навалай.

Бальшавікі бядуюць, што ў Менскім Пэдагагічным Інстытуце „пануе прытупленьне клясавай пільнасьці“. Факты зажыму крытыкі былі выкрыты на агульным сходзе, але ні камсамольская арганізацыя, ні парткалектыў не рэагавалі на іх. Прымацаваная да камсамолу па лініі партарганізацыі т. Фодзіман завяла клясава-варожыя вылазкі „Давайце лепш аб гэтым не гаварыць“ — заяўляе страціўшая клясавую пільнасьць Фодзіман. Аналёгічныя выпадкі мелі месца і на гістарычным аддзяленьні.

„...Ленінская нацыянальная палітыка скажаецца ў Пэдагогічным інстытуце. Досыць сказаць, што бел. мову выкладае нацдэмакрат Багдановіч.

„Багдановіч заявіў: „Я не разумею, калі мне гавораць паруску“ — ня гледзячы на тое, што ён добра ведае гэтую мову. Курсорг Нікіцін, які заўсёды падтрымліваў Багдановіча, забараніў студэнтам карыстацца ў прыватным жыцьці рускай мовай“. — Бальшавікі забаранілі ў школах карыстацца падручнікам „Гісторыя Беларусі“ Ігнатоўскага, ён бо „нацдэмаўскі“.

А студэнтаў і вучняў, якія змагаюцца за беларускую мову ў школах, прыказана выкінуць, „ачысьціць“ школы ад „нацдэмаўшчыны.“

А таксама ўзялі камуністы ў крыжовы агонь Дырэктара плянова-эканамічнага камбінату (Менск) Гурло, за тое, што той даў „загад“ студэнтам наступнага зьместу:

„...Пропаную ўсім навуковым працаўнікам і студэнтам карыстацца бел. мовай як на лекцыях, так і ў штодзенным жыцьці і г. д.“ За гэтую прапанову пасыпаліся на галаву Гурла бальшавіцкія напасьці, зрабілі яго нацдэмам, контррэвалюцыянэрам і т. п.

З усяго выглядае, што ў практыцы беларусізацыя забараняецца, а тых, што праводзяць беларусізацыю, бальшавікі цягнуць да адказнасьці. Такім чынам работа ў гэтым напрамку ў БССР забараняецца. Дык навошта-ж пісаць і закладаць „пяцілеткі“ аб беларусізацыі? — Уся бальшавіцкая работа ў галіне нацыянальнай ёсьць толькі тыпова бальшавіцкай хлусьнёй.

Міма аднак усяго, ня трэба быць пэсымістым, бо народ наш нават у такіх умовах жыве, усьведамляецца, крышталізуе думку аб поўнай дзяржаўнай незалежнасьці.

Л. Бурны.

З заграніцы.

Вэрсальскі трактат хістаецца. Фундамэнт, на якім пабудавана пасьляваенная Эўропа — Вэрсальскі трактат (дагавор) — ужо хістаецца. Пераможнікі ў сусьветнай вайне, што гэты трактат дыктавалі, уважалі яго за справядлівы і верылі, што ён створыць такую палітычную будову, якая „здаволіць" і нездаволеных. Для гэтага сумысна была створана Ліга Нацый, ці лепш — Ліга Дзяржаваў. Але жыцьцё не паслухала „моральнага" аўторытэту Лігі і не спакарнела прад ягонай „сілай". Уся „дабрата" Вэрсальскага Трактату адразу і найбольш яскрава адчулася ў найбольш чулым мейсцы — у галіне гаспадарчай. Звальненьне Нямеччыны ад сплаты ваенных адшкадаваньняў было першым і моцным ударам у непарушнасьць мірных дагавораў Вэрсальскага Трактату. Далейшае разьвіцьцё сусьветнага гаспадарчага хаосу завастрае ня меншай сілы хаос і ў жыцьці палітычным. Пачынаюць адклікацца галасы з дамаганьнем рэвізіі Вэрсальскага Трактату. Сьпярша гэтыя галасы былі чутны толькі з боку пераможаных, а цяпер гавораць аб гэтым і пераможнікі.

Галоўную роль у дамаганьні рэвізіі Вэрсальскага Трактату грае пераможаная Нямеччына. Сьпярша ў гэтай справе яна была адна. Сяньня ўжо дамаганьні Нямеччыны знаходзяць падтрыманьне і сярод палітычных кругоў пераможнікаў Францыі. Вялікай прыхільніцай рэвізіі Вэрсальскага Трактату зьяўляецца і Італія.

Словам, Вэрсальскі Трактат моцна захістаўся і напору жыцьцёвых патрэб хіба ня ўстрымае.

Суседзі Нямеччыны трывожацца. Пасьля апошніх парляманцкіх выбараў у Нямеччыне, у якіх перамог з сваей партыяй „народных соцыялістаў" сучасны нямецкі канцлер Гітлер, суседзі Нямеччыны пачалі трывожыцца. Прэса суседніх дзяржаў Нямеччыны падняла такі крык, што здаецца Нямеччына сталася грознай усяму сьвету. Загаварыла не паўголасам, бо „во всеуслышание" і прэса бальшавіцкая. Але з крыку бальшавікоў дык і ня дзіва, бо Гітлер з сваёй партыяй гэта сапраўдны пагромшчык камунізму. Такога моральнага ўдару, які яму прычыніў народна-соцыялістычны рух у Намеччыне, камунізм ніколі ня меў. — Дагэтуль у Зах. Эўропе найбольш моцным цэнтрам камунізму была Нямеччына. А тут, без надзвычайнага тэрору з боку гітлераўскіх уладаў, з камуністаў толькі пыл курыць; гітлерызм у Нямеччыне праявіўся радыкальным і больш рэальным ад камунізму. Гэты моральны ўдар па камунізьме ў Нямеччыне адбіўся гулкім рэхам па ўсім сьвеце і бязумоўна мае свой прыгнятаючы водгук і ў СССР.

Не бяз прычыны падняла крык аб Гітлеру і гітлераўцах французская і польская прэса. А прычына гэта ў тым, што паводле праграмы гітлераўцаў у справе заграгічнай палітыкі на першым пляне стаіць рэвізія Вэрсальскага Трактату.

Літва-Беларусь-Украіна. Польскія газэты пішуць, што ў праграму гітлераўскай міжнароднай палітыкі ўваходзіць і стварэньне Літоўска-Беларуска - Украінскай дзяржаўнай фэдэрацыі. Тыя-ж газэты падаюць, што ў гэтай справе быццам ужо адбылася і нарада у Лёкарно між нямецкімі гітлераўцамі і італьянскімі фашыстамі, на якой гітлеравец Розэнбэрг быццам падаў і плян гэтай акцыі, якая мела-б пачацца адарваньнем Радавай Украіны ад Расеі. Словам, пішуць ужо і аб новых граніцах у Эўропе.

Крывавая расправа ў СССР. У мінулым тыдні скончыўся ў Саветах суд над 75 б. камуністычнымі ўрадаўцамі. Камуністычная ўлада абвінавачвала ўсіх іх за „контррэвалюцыю і сабатаж" на Украіне, Беларусі і паўночным Каўказе. З усіх 75абвінавачаных, 35 засуджаны на кару сьмерці, 22—па 10 гадоў катаргі, а 18—па 8 гадоў вастрогу. Засуджаныя на сьмерць расстраляны.

Японска-Кітайская вайна. Апошнімі часамі кітайцы пераарганізаваўшыся сільна пачалі наступаць на японцаў, каб выгнаць іх з сваей зямлі. Ідуць заўзятыя баі.

Эўропа прадае аружжа на вайну на Далёкім Усходзе. Месяц таму ня больш быў падняўшыся ў Эўропе праект, каб не прадаваць аружжа ваюючым дзяржавам на Далёкім Усходзе; было „пастаноўлена" не прадаваць. Гэткая „пастанова", рэч зразумелая, была помачай Японіі процію Кітаю, бо Японія мае добра зарганізаваны промысел і купляць аружжа не патрабуе, а Кітай — патрабуе, бо свайго аружжа ня мае.—Але вось Японія не паслухала ляпятаньняў „цёткі Лігі" і гэтым крыху спракудзілася Эўропе; дык цяпер Эўропа адкрыта прадае аружжа на Далёкі Ўсход, абы толькі куплялі...і ваявалі.

Да нас пішуць.

Весткі з Постаўскага павету.

Дунілавічы. Цяжка жывецца нашаму сялянству: заработкаў няма ніякіх. Працы няма чаго, а калі што і ёсьць, дык ідзе без цаны. Грошы на ўсё патрэбны, а найбольш на падаткі; але дзе іх браць, дык і няведама. Сэквэстратары за падаткі забіраюць усё магчымае, нават і рэлігійныя абразы. Надовячы ў нас на рынку сэквэстратар прадаў на ліцытацыі забраны ў селяніна за падаткі абраз Маці Божай за 4 зл. 50 гр.

Прысутны.

Незразумелая місія.

Ажуны. У нас зьмяняюцца сьвяшчэньнікі чуць ня што год і ўсё прыяжджаюць быццам новыя, такія-ж самюсеньнія расейцы. Беларуса сьвяшчэньніка да нас чамусьці не прысылаюць. Народ наш беларускі расейскіх пропаведзяў не разумее, а беларускіх пропаведзяў ня чуе. Дык вось дзеля гэтага завяліся ў нас сэктанты. Цяпер гэтых сэктантаў прыяжджае да нас выганяць місія і таксама парасейску. Вось 22.II. сёл. г. прыехала да нас гэтая місія, якая складаецца з некалькіх сьвяшчэньнікаў і паехала ў в. Кейзікі маліцца і гаварыць пропаведзі процію сэкты баптыстаў. Народу сабралася многа. Пасьля набажэнства пачаліся пропаведзі і ведама —парасейску. Народ і місіянэраў не зразумеў. Нарэшце знашоўся свой чалавек сьвяшчэньнік і давай прагаварваць у роднай мове—пабеларуску. Усім стала ясна і зразумела.

Народ павесялеў, бо зразумеў аб што йдзе.

Трэба нам пастыраў-духоўнікаў беларусаў і беларускіх пропаведзяў, бо інакш, дык сэктанства нашых людзей зусім збаламуціць.

Праваслаўны беларус.

Полёнізатарскія натугі.

Бараўкі. У нашых ваколіцах полёнізататарскія натугі не слабыя, але наш народ не паддаецца і моцна трымаецца сваей роднай беларушчыны. Польскі ксёндз арганізаваў у нас эндэцка-ксяндзоўскую арганізацыю „Стоважышэне млодзежы польскей", — але не ўдалося. Арганізавалі ў нас так жа „пшыспособене", „клюб спортовы"— не ўдалося і гэта. Цяпер забаўляюцца ў „стшэльца" і таксама няўдала выходзіць. Нядаўна ў „сьвятліцы" гэтага-ж „Стшэльца" была „забава". Туды нашых (абдурманеных) „стшэльцаў" ня ўпусьцілі, бо там гулялі паны. А гулялі яны там дык надта гучна, як бы ня было бядыня толькі ў нас, але і на цэлым сьвеце. Для нашых „стшэльцаў" гульба была зроблена назаўтра: нанялі музыканта, які граў на губным гармонічку, а хлопцы „бавілісень". На гэту „забаву" пасьля паноў маглі йсьці ўсе, хто заплаціў за ўваход 20 грошаў. Але некаторыя не патрапілі „бавіцьсень" на гэтай „забаве" і без паноў, бо начальства „забавы" пачало іх выпрашваць ці проста кажучы выганяць з „сьвятліцы".

Моладзь беларуская! Чаго Ты валочышся там, дзе ня трэба. Кінь валачыцца і йдзі ў сваю арганізацыю, прыкладам Бел. Інстытут Гаспадаркі і Культуры і там прывучайся да парадку, багацячыся ў веду і веру ў лепшае заўтра. Бышы Стшэлец.

Выпісывайце і чытайце „Бел. Крыніцу."

в. **Плужыны**, Цырынскай гм., Навагрудзкага пав. У нас цёмныя людзі адстрашываюць праваслаўных беларусаў ад „Белар. Крыніцы," гаворачы, што гэта газэта каталіцкая. Я праваслаўны, а аднак чытаю „Белар. Крыніцу" і аб ёй мушу сказаць, што яна толькі сапраўды беларуская газэта, роўна прыгодная як для праваслаўных, так і для каталікоў. Дык няма чаго баяцца праваслаўным беларусам „Бел. Крыніцы", яна з дарогі ня зводзіць ні праваслаўных, ні каталікоў, але ўсіх беларусаў лучыць у адну беларускую народную сям'ю і аднолькава бароніць правы беларусаў каталікоў і праваслаўных. Гэта газэта змагаецца з расейшчынай і польшчынай і таму ня любяць яе толькі масквафілы і полёнафілы. Апрача гэтага змагаецца яна з цемрай і бясправ'ем. А цемра ў нас вялікая і на яе трэба заклікаць да нас „Бел. Крыніцу", каб яна яе ад нас выгнала.

Я музыкант і граю па вёсках вясельлі і на вечарынах. Надовячы давялося мне граць вясельле ў вёсцы, дзе моладзь ніяк ня можа расстацца з гарэлкай. Гуляе яна традыцыйныя гульні з гарэлкай і „весяліцца" толькі з гарэлкай. Гэткія гульні заўсяды не абходзяцца бяз боек, а па бойках справы вырашаюцца паліцэйскімі пратаколамі. Гарэлку п'юць усе, але ня ўсе чытаюць газэты. У гэтай вёсцы толькі адзін малады хлапчук цікавіцца беларускімі кніжкамі і газэтамі.—Дык няхай гэты хлапчук будзе прыкладам старэйшым. Выпісывайце родную беларускую газэту „Бел. Крыніцу," чытайце яе, а яна вас навучыць як прагнаць з вёскі гарэлку, а з ёй—і цемру.

Валянцюк.

З жыцьця нашай моладзі.

Валяўка, Навагрудзкага пав. Яшчэ нядаўна нашу моладзь вадзіла за нос польскае „Коло млодзежы вейскей": час ад часу цешылі беларуска польскім прадстаўленьнем на польскі лад, пасьля „сьвятліцай" і абэцанкай. Цяпер у нас ужо ня тое. Пашыраецца „Бел. Крыніца", а з „Крыніцай" многія дасталі беларускіх кніжак. Сьведамасьць пашырылася і паглыбілася. Ужо зусім пара, каб наша моладзь залажыла сваю беларускую культурна-прасьветную арганізацыю, прыкладам гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры і працавала супольна ў арганізацыі над пашырэньнем роднай асьветы і культуры.

В. А.

Цемната і п'янства шырыцца, а паліцыя пытае 10 запаведзяў.

Цырынь, Навагрудзкага пав. Даўно ўжо гэта было, каб у нашай ваколіцы моладзь, напіўшыся гарэлкі, разбівала сабе ўзаемна галовы. Заўсяды, прад кожным важнейшым сьвятам, расклейваліся абвесткі, што ў той ці іншай вёсцы гурток Т.Б.Ш. ладзіць беларускае прадстаўленьне, на якое моладзь сходзілася, а пасьля і ў сваёй вёсцы ладзіла такое-ж прадстаўленьне.

Ня тое мы бачым цяпер. Сяньня ўсе гурткі Т.Б.Ш. зачынены, бібліятэкі гэтых гурткоў або апячатаваны, або паліцыяй забраны. Там, дзе былі гурткі Т.Б.Ш., яшчэ і сяньня жыве бадзёры беларускі дух, а дзе сьведамасьць была слабейшая, моладзь ужо варочаецца да гарэлкі. Прыкладам вёскі Крышлаўшчына і Вухнева, Стаўпецкага пав., у якіх ніякіх культурна-прасьветных арганізацыяў ня было: там гарэлка знайшла ўжо сваіх паклоньнікаў. А дзе гарэлка, там і бойка. У гэтых вёсках разбоі, а разам з гэтым і зладзействы частымі здарэньнямі. Дня 17 лютага с. г. паднялася там сярод моладзі такая бойка, што выглядала на вайну дзікіх плямёнаў, бо „ваявала" вёска з вёскай. І за што? — За глупства! — пасварыліся.

Дарагая моладзь! Стыдна гэтак рабіць. Гэтым Ты ганьбіш сябе і сваю чалавечую годнасьць. Кінь піць гарэлку, а за гэтыя грошы выпішы сабе родную газэту, купі добрую кніжку, дык зразумееш агіду сваіх гэткіх паступкаў і навучышся як змагацца за лепшую долю.

А паліцыя робіць у нас „сваю" работу і пытаецца 10 запаведзяў.

Дня 28 м. м. селянін в. Жухавіч ехаў з лесу і спаткаўся з паліцыяй. Паліцыя задзяржала фурманку і давай пытаца:—„званок ёсьць?" — „ёсьць!" — „конь укелзаны"? —„укелзаны!" — «Пашпарт для каня ёсьць?" — „няма!"—„Чаму няма?" — бо забралі ў гміну на нейкую там справу!" — „Пан праваслаўны?" — „так!" — „Гавары 10 запаведзяў!" Селянін, думаючы, што і ў гэтай справе ня можна адмовіцца, давай пералічаць адну па другой усе 10 запаведзяў Божых... Аб гэтым адпаведныя ўлады павінны павучыць ніжэйшых функцыянараў паліцыі, што Запаведзі Божыя не да іх належаць, бо на гэта ёсьць духаўнікі, якія, ня думаю, каб дзяліліся сваей функцыяй з паліцыяй.

— Ці ж ужо і гэтыя справы належаць да паліцыі?

Вясковы.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.